# *§ 15–0. Сацыяльныя наступствы прамысловай рэвалюцыі ў Беларусі

БУРЖУАЗІЯ
ПРАЛЕТАРЫЯТ
КУПЕЦ ПАМЕШЧЫК
МІГРАЦЫЯ ПАДАТАК
ПРЫГОННАЕ ПРАВА
ПРАМЫСЛОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ
ІНДУСТРЫЯЛЬНАЕ ГРАМАДСТВА

**Фарміраванне новых сацыяльных груп**

**1. Змяненне сацыяльнай структуры беларускага грамадства.** Прамысловая рэвалюцыя прывяла да сістэмных змен у сацыяльнай структуры насельніцтва Беларусі. У XIX ст. паступова фарміруюцца класы і сацыяльныя групы буржуазнага грамадства, у першую чаргу буржуазія і пралетарыят.

**Буржуазія**

Буржуазія мела разнародны сацыяльны і нацыянальны склад. Прадпрымальнікі беларускіх губерняў вылучаліся вышэйшай удзельнай вагой прадстаўнікоў дваранства і мінімальным удзелам сялянства. Купцы і мяшчане паступова выціскалі дваран з прамысловага прадпрымальніцтва. У Беларусі гандлёвая буржуазія мела больш значныя капіталы ў параўнанні з прамысловай. Аграрная буржуазія фарміравалася з ліку заможных сельскіх гаспадароў і землеўладальнікаў, якія арганізоўвалі свае гаспадаркі на прадпрымальніцкай аснове.

Складзіце схему, якая адлюстроўвала б асаблівасці класа буржуазіі, што фарміраваўся ў XIX ст.

**Структура беларускага грамадства**

**2. Станаўленне класаў і колаў буржуазнага грамадства.** У Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. адбываўся працэс станаўлення класаў і колаў буржуазнага грамадства. Аднак гэты працэс у згаданы гістарычны перыяд не завяршыўся.

Не скончылася таксама разлажэнне саслоўна-карпаратыўнай арганізацыі насельніцтва. Усё гэта прывяло да таго, што беларускае грамадства на мяжы XIX–XX ст. мела шматслойную структуру. У ім суіснавалі розныя па часе паходжання сацыяльныя групы. Для беларусаў у параўнанні з іншымі этнічнымі групамі еўрапейскай часткі Расійскай імперыі была характэрная найвышэйшая адносная доля занятых у сельскай гаспадарцы і мінімальная — у прамысловасці.

**Буржуазія**

Пачынаючы з канца XIX ст. заняткі рознымі відамі прадпрымальніцкай дзейнасці ў Беларусі пераставалі залежаць ад прыналежнасці да пэўнай саслоўнай групы. У той жа час станаўленне беларускай прадпрымальніцкай эліты стрымлівала яе разрозненасць паводле нацыянальна-канфесійнай прыкметы. Вызначальнымі для станаўлення прадпрымальніцкага асяродку Беларусі зрабіліся структура мясцовага эканамічнага жыцця, канцэнтрацыя вытворчасцей і капіталаў на дробных прадпрыемствах. Усё гэта не спрыяла кансалідацыі мясцовай буржуазіі.

**Рабочы клас**

Рабочы клас Беларусі фарміраваўся ў значнай ступені з сялян, якія шмат у чым захоўвалі сваю сувязь з вёскай. Патомных рабочых было мала. Нягледзячы на сваю нешматлікасць і незавершанасць працэсаў кансалідацыі, раскіданасць па невялікіх прадпрыемствах, рабочы клас істотна ўплываў на трансфармацыйныя змены ў беларускім грамадстве ў другой палове XIX — пачатку XX ст.

**Становішча сялян**

**3. Становішча сялян і рабочых.** Сялянства ў XIX — пачатку XX ст. было самай вялікай па колькасці групай насельніцтва Беларусі. Большасць сялян заставаліся малазямельнымі. Гэтая праблема дапаўнялася цераспалосіцай (размяшчэннем зямельных участкаў адной гаспадаркі палосамі ўперамежку з чужымі ўчасткамі). Сяляне былі абцяжараны разнастайнымі павіннасцямі — выкупнымі плацяжамі,

земскімі зборамі і г. д. Самастойнасць гаспадарчай дзейнасці вясковых жыхароў стрымлівалася кругавой парукай, што існавала доўгі час, абмежаваннямі свабоды перамяшчэння і інш. Пасля адмены прыгоннага права сялянства заставалася абмежаваным у сваіх правах саслоўем.

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

Карыкатура 1860-х гг. на аграрныя адносіны суправаджалася тэкстам.

Памешчык: «Што ты, мужычок, на адной назе стаіш?».

Селянін: «Ды другую, бачыш, паставіць няма куды. Усюды вашамосці зямліца. Баюся, яшчэ за патраву судзіць будзеце» *(патрава — псаванне, вытоптванне чалавекам або жывёлай сельскагаспадарчых пасеваў).*

1. *Якую сялянскую праблему другой паловы XIX ст. дэманструе гэтая карыкатура?*
2. *Якія яшчэ абмежаванні вымушалі сялян «стаяць на адной назе»?*



*Карыкатура 1860-х гг.*

### Змены ў становішчы сялянства

Змены ў становішчы сялянства адбываліся пад уплывам развіцця рынычных адносін. З гэтым працэсам былі звязаныя маёмаснае расслаенне, рост міграцыйнай актыўнасці сялян і інш. Больш заўважнымі яны робяцца пачынаючы ад 80-х гг. XIX ст. пад уздзеяннем сусветнага аграрнага крызісу.

### Формы сялянскага руху

Сяляне былі незадаволены сваім цяжкім становішчам, і гэта выклікала ў іх пратэст. Яны патрабавалі вяртання зямель, адрэзаных у іх падчас адмены прыгоннага права, змяншэння падаткаў і павіннасцей. Да рэвалюцыйных падзей 1905–1907 гг. сяляне захоўвалі рысы наіўнага манархіз-



*Выступленне сялян. Другая палова XIX ст.*

му (веру ў добрага цара-бацюхну), якія спалучаліся з досыць пасіўнымі і малаарганізаванымі формамі сацыяльнага пратэсту. Самымі пашыранымі сярод іх былі самавольнае выкарыстанне лугоў і пашаў, парубкі лесу, патрава ўгоддзяў, захоп ворных зямель. Досыць часта сяляне карысталіся легальнымі формамі супраціву — падавалі скаргі і прашэнні ў розныя ўстановы, арганізоўвалі супраць памешчыкаў судовыя іскі і інш.

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж развіццём рынначных адносін і маёмасным расслаеннем сялян, іх міграцыйнай актыўнасцю.

## Становішча рабочых

Адмена прыгоннага права прывяла да фарміравання рынку вольнанаёмнай працы, што, у сваю чаргу, выступіла ўмовай эканамічнага развіцця. Становішча рабочых у сярэдзіне XIX ст. было фактычна бяспраўнае. Выкарыстоўваліся жорсткія метады эксплуатацыі наёмных работнікаў, ужывалася жаночая і дзіцячая праца, рабочы дзень доўжыўся 13–14 гадз. Матэрыяльнае становішча многіх рабочых было вельмі цяжкае.

Растлумачце прычынна-выніковую сувязь паміж адменай прыгоннага права і фарміраваннем рынку наёмных рабочых.

## Формы рабочага руху

Цяжкае становішча рабочых было прычынай іх барацьбы за сацыяльныя правы. Практычна ўсе выступленні на пачатковым этапе былі выкліканы

эканамічнымі прычынамі. На мяжы 70–80-х гг. XIX ст. рабочыя Беларусі пачалі выкарыстоўваць новую форму барацьбы — **забастоўку**.

.

**Забастоўка (стачка)** — калектыўнае спыненне працы рабочымі з мэтай задавальнення сваіх эканамічных або палітычных патрабаванняў.

Адным з найбуйнейшых выступленняў рабочых была забастоўка ў Гомелі ў механічных майстэрнях Лібава-Роменскай чыгункі ў маі-чэрвені 1886 г. У ёй брала ўдзел больш за 500 чалавек. Нагодай для забастоўкі выступілі зніжэнне памераў заработнай платы і пагаршэнне ўмоў працы. Забастоўка набыла такі размах, што на яе задушэнне былі накіраваныя паліцыя і войскі. Аднак забастоўшчыкі не здаваліся. Іх падтрымалі рабочыя многіх прадпрыемстваў горада і чыгуначнага вузла. У канфлікт умяшаўся губернатар, і новыя правілы былі адмененыя. Атрымаўшы перамогу, чыгуначнікі выйшлі на работу



Ад сярэдзіны 90-х гг. XIX ст. рабочыя Беларусі пачалі ладзіць маёўкі — святкаваць 1 Мая як Дзень міжнароднай салідарнасці працоўных. Першымі гэтую акцыю правялі пралетарыі Мінска. Маёўкі мелі нелегальны характар, а іх удзельнікаў пераследавала паліцыя. Рабочыя праяўлялі сябе як сацыяльна актыўная, палітызаваная частка грамадства. Пралетарыят папаўняўся за кошт збяднелага сялянства, мяшчан, рамеснікаў і гандляроў. Рабочы клас Беларусі быў шматнацыянальны і шматканфесійны паводле складу. У сельскай мясцовасці большасць яго складалі беларусы, у гарадах і мястэчках — яўрэі.

Паразважайце, чаму ўрад вымушаны быў пайсці на саступкі рабочым.
Што паспрыяла перамозе чыгуначнікаў?

**Прыняцце законаў па рэгуляванні працоўных адносін**

Нарастанне сацыяльнага канфлікту паміж рабочымі і ўладальнікамі прадпрыемстваў было прычынай першых мерапрыемстваў у галіне працоўнага заканадаўства. Іх ініцыятарам была дзяржаўная ўлада ў асобе міністра фінансаў імперыі М. Х. Бунге. Законам ад 1 чэрвеня 1882 г. забаранялася праца на фабрыках і заводах дзяцей ва ўзросце да 12 гадоў, а таксама праца ў начны час для непаўналетніх. Працоўны дзень для дзяцей ва ўзросце 12–15 гадоў абмяжоўваўся 8 гадзінамі. Стваралася інспекцыя для кантролю за выкананнем фабрычнага заканадаўства.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

**З Працоўнага Кодэкса Рэспублікі Беларусь**

Артыкул 114. Для работнікаў, маладзейшых за 18 гадоў, устаноўлена скарочаная працягласць рабочага часу:

для работнікаў ва ўзросце ад 14 да 16 гадоў — не больш за 23 гадзіны на тыдзень;

для работнікаў ва ўзросце ад 16 да 18 гадоў — не больш за 35 гадзін на тыдзень.

Артыкул 115. Працягласць штодзённай працы (змены) не можа перавышаць:

для работнікаў ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў — 4 гадзіны 36 хвілін, ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў — 7 гадзін;

для навучэнцаў, якія атрымліваюць агульную сярэднюю, прафесійна-тэхнічную адукацыю, спецыяльную адукацыю на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, што працуюць на працягу навучальнага года ў вольны ад вучобы час, ва ўзросце ад чатырнаццаці да шаснаццаці гадоў — 2 гадзіны 18 хвілін, ва ўзросце ад шаснаццаці да васямнаццаці гадоў — 3 гадзіны 30 хвілін.

1. *Параўнайце ўмовы дзіцячай працы ў XIX ст. і ў цяперашні час. Вызначце, якія змены адбыліся.*
2. *Як вы лічыце, чаму дзяржавы заканадаўча абмяжоўваюць працягласць і ўмовы дзіцячай працы?*

Закон ад 2 чэрвеня 1897 г. для дарослых рабочых усталёўваў максімальны рабочы дзень працягласцю не больш за 11,5 гадзіны. Замацоўваліся нядзельныя і святочныя дні адпачынку. Аднак фабрычна-заводскае заканадаўства Расійскай імпе-

ры ў гэты час змяшчала мноства недакладных фармулёвак, што часцяком дазваляла прадпрымальнікам абыходзіць яго.

У 1903 г. была ўведзена адказнасць прадпрымальнікаў за няшчасныя выпадкі з рабочымі падчас працы. Наступным крокам у галіне страхавання, сацыяльнага забеспячэння рабочых было прыняцце 23 чэрвеня 1912 г. пакета законаў аб забеспячэнні рабочых у сувязі з няшчаснымі выпадкамі і захворваннем.

Перадумовы і прычыны працоўнай міграцыі

**4. Працоўныя міграцыі.** Пад уплывам прамысловай рэвалюцыі, працэсаў станаўлення індустрыяльнага грамадства ўзмацніліся міграцыі (тэрытарыяльныя перамяшчэнні) насельніцтва, якія былі выклікаланы перш за ўсё эканамічнымі прычынамі, неабходнасцю пошуку працы, дадатковых заробкаў.

Міграцыя сялянства пасля адмены прыгоннага права

У першыя дзесяцігоддзі пасля адмены прыгоннага права беларускія сяляне паказвалі невысокі ўзровень міграцыйнай актыўнасці ў параўнанні з іншымі народамі Расійскай імперыі. Насельніцтва беларускіх губерняў у той час складала 7,5 % жыхароў еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, а беларусаў сярод тых, хто выпраўляўся на адыходныя промыслы, было каля 5 %.

Выхадцы з вёскі мелі няшмат шанцаў знайсці работу ў беларускіх гарадах з прычыны слабасці гарадской прамысловасці, невялікай яе патрэбы ў рабочых руках, а таксама канкурэнцыі з боку яўрэйскай беднаты. Яны часцей знаходзілі сабе занятак на будаўніцтве чыгунак, прадпрыемствах Масквы, Пецярбурга, Адэсы і інш. Большасць сялян адыходзілі на кароткачасовыя заробкі. Вылучалася нават пэўная рэгіянальная спецыялізацыя адыходу: насельніцтва Віцебскай і Віленскай губерняў кіравалася ў Пецярбургскую губерню, Магілёўскай і Мінскай — у Кіеўскую, Екацярынаслаўскую і Херсонскую, Гродзенскай — у Варшаўскую губерню.



*Будаўніцтва чыгункі. Другая палова XIX ст.*

### Міграцыі на мяжы XIX–XX стст.

На мяжы XIX–XX стст. міграцыі насельніцтва Беларусі робяцца больш актыўнымі, у першую чаргу за яе межы. Тэрытарыяльныя перамяшчэнні гэтага перыяду таксама былі выкліканы эканамічнымі прычынамі. На тэрыторыі беларускіх губерняў востра адчувалася аграрная перанаселенасць — лішак насельніцтва ў адносінах да колькасці сельскагаспадарчых зямель, якія апрацоўваліся. Сяляне вымушаныя былі шукаць дадатковыя заробкі, накіроўвацца ў прамысловыя цэнтры Расійскай імперыі, перасяляцца ў малаабжытыя раёны за Урал.

За межы Беларусі ў іншыя рэгіёны еўрапейскай часткі Расійскай імперыі, перш за ўсё прамысловыя цэнтры — Маскву, Пецярбург, Данбас і інш., — у пошуках працы накіравалася каля 600–800 тыс. чалавек. Толькі ў Пецярбурзе перад пачаткам Першай сусветнай вайны жыло звыш 70 тыс. выхадцаў з беларускіх губерняў. Часцяком іх пачаткова прыцягвалі на некваліфікаваныя работы, брукаванне вуліц, падсобныя і земляныя работы.

### Перасяленне сялян у аддаленыя раёны Расійскай імперыі

**5. Перасяленчы рух.** Значным быў перасяленчы рух сялян туды, дзе, на іх думку, было шмат зямлі і сапраўдная воля, — у Сібір, на Далёкі Усход, Паў-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



*Беларускія перасяленцы ў Сібіры*

Міграцыя беларускага сялянства ў Сібір актывізавалася напачатку XX ст. На тэрыторыі шэрагу раёнаў Заходняй Сібіры перасяленцы з Беларусі атрымалі назву «самаходы». Яны прынеслі ў Сібір культуру лёну. У гэты перыяд ужо ствараліся кааператывы, якія збіралі і збывалі лён і выраблялі льняныя тканіны.

1. *Чаму беларускіх перасяленцаў называлі «самаходамі»?*
2. *Пры дапамозе дадатковых крыніц інфармацыі даведайцеся, што новага беларускія перасяленцы ўнеслі ў жыццё Сібіры.*

ночны Каўказ. На мяжы XIX–XX стст. урадавая палітыка была скіравана на тое, каб заахвоціць сялян перасяляцца на ўсход Расійскай імперыі. На першыя пазіцыі ў краіне па колькасці перасяленцаў у Сібір у гэты час выйшлі Магілёўская і Віцебская губерні. Усяго з тэрыторыі Беларусі на слабазаселеныя землі за Урал накіравалася ў канцы XIX — пачатку XX ст. каля 420–450 тыс. чалавек.

**Міграцыя за межы Расійскай імперыі**

Напачатку XX ст. заўважнай робіцца працоўная міграцыя ў краіны Захаду. Там выхадцы з Беларусі працавалі на самых цяжкіх работах. Сваё знаходжанне за мяжой яны часта разглядалі як часовае, з мэтай зарабіць грошы для ўкладання іх ва ўласную гаспадарку на радзіме. Часцяком у іх гэта атрымоўвалася. Менавіта дзякуючы інвеставанню ў сельскую гаспадарку зробленых сялянамі «амерыканскіх» грошай параўнальна больш выніковым аказалася правядзенне на тэрыторыі Беларусі сталыпінскай аграрнай рэформы.

**Наступствы працоўнай міграцыі**

Ад’езд на заробкі за мяжу, у прамысловыя цэнтры Расійскай імперыі аказаў станоўчы ўплыў на фарміраванне рынку рабочай сілы ў Беларусі. Нават сяляне, якія па вяртанні на радзіму не здолелі абзавесціся ўласнай гаспадаркай, паспяхова спаборнічалі на рынку працы, ствараючы больш кваліфікаваную групу наёмных работнікаў.

*Да пачатку XX ст. у Беларусі не завяршыўся працэс станаўлення класаў і сацыяльных груп індустрыяльнага грамадства. Рабочы клас і буржуазія былі нешматлікія і разрозненыя паводле этнічнай і канфесійнай прыналежнасці. У беларускім грамадстве па-ранейшаму захоўваўся падзел на саслоўныя групы. Прамысловая рэвалюцыя і фарміраванне індустрыяльнага грамадства абумовілі працоўныя міграцыі беларусаў.*

| **калі ў свеце...** | **на тэрыторыі Беларусі...** |
| --- | --- |
| 1884 г. — прыняцце закона аб свабодзе прафсаюзных арганізацый у Францыі | 1885 г. — прыняцце закона аб забароне начной працы жанчын і непаўналетніх ва ўзросце да 17 гадоў на шкодных вытворчасцях |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Як змянілася сацыяльная структура беларускага грамадства ў выніку прамысловай рэвалюцыі? Якія новыя класы буржуазнага грамадства фарміраваліся?
2. Складзіце схему «Асноўныя класы буржуазнага грамадства ў Беларусі напачатку XX ст.», адлюструйце ў ёй крыніцы фарміравання асноўных класаў буржуазнага грамадства.
3. Якія сацыяльныя супярэчнасці абвастрыліся ў беларускім грамадстве ў XIX ст.?
4. Ахарактарызуйце формы сялянскага руху ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Якія мэты ён ставіў? Якіх вынікаў дасягнуў?
5. Прывядзіце прыклады эканамічнай і палітычнай барацьбы рабочых Беларусі ў другой палове XIX — пачатку XX ст. Якая з іх пераважала і чаму? Якія захады зрабіла дзяржава, каб паменшыць маштабы рабочага руху?
6. Вылучыце прычыны і асноўныя напрамкі працоўнай міграцыі сялян у другой палове XIX — пачатку XX ст. Якія фактары вызначалі міграцыйную актыўнасць беларускага насельніцтва?